*Рыхтуемся да алімпіяды*

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## ТРЭЦІ ЭТАП XXVIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ

### IX КЛАС

**Заданне 1.** Рашыце "гукавую прапорцыю". Запішыце, чым адрозніваюцца гукі, якія ўваходзяць у кожную з яе пар.

Максімальная колькасць балаў – 4.

Вэ[*дз*]гаць : пэ[*ц*]каць = ду[*б*]ок : ($x^1$) ___ = ($x^2$) ___ : [*ч*]ацвер = ($x^3$) ___ : [*к*]арак.

Вылучаныя гукі ў словах адрозніваюцца_______.

**Заданне 2.** Вызначце і запішыце па-беларуску лексічнае значэнне беларускага і рускага слоў у пары міжмоўных амонімаў.

Узор: бел. *люстра* – руск. *люстра*: 'адшліфаваная паверхня (шкла, металу), здольная даваць адбіткі тых прадметаў, якія знаходзяцца перад ёю, а таксама спецыяльна зроблены прадмет з такой паверхняй' – 'падвесны асвятляльны прыбор з некалькімі крыніцамі святла (электралямпамі ці свечкамі) і аздобленай арматурай'.

Максімальная колькасць балаў – 3.

| | |
|---|---|
| 1) месны – местный | |
| 2) поўнач – полночь | |
| 3) маніць – манить | |

**Заданне 3.** Аб'яднайце пары слоў у групы паводле сэнсавых адносін. Назавіце гэтыя групы.

Максімальная колькасць балаў – 5.

Адзець – скінуць, налева – направа, невычэрпны – незлічоны, няўдача – фіяска, фабрыкант – фабрыкат.

**Заданне 4.** Размяркуйце словазлучэнні ў табліцы.

Максімальная колькасць балаў – 5.

(А, а)хілесава (П, п)ята, (Б, б)ожая (М, м)аці, (Г, г)рафства (С, с)усэкс, (Д, д)амоклаў (М, м)еч, (Дз, дз)ень (Б, б)ібліятэк, (Дз, дз)ень (П, п)ерамогі, (З, з)осьчыны (Р, р)эчы, (Л, л)яднік (Л, л)амберта, (Дз, дз)якаваць (Б, б)огу [усё добра], (Р, р)од (С, с)апегаў.

| Усе словы з малой літары | 1-е слова з вялікай літары | 2-е слова з вялікай літары | Усе словы з вялікай літары |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Заданне 5.** Растлумачце значэнне фразеалагізма. Запішыце прыклады, у якіх названы фразеалагізм выконвае ролю розных членаў сказа.

Максімальная колькасць балаў – 6 (1 + 5).

Правая рука '______________________'.

| Член сказа | Прыклад |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 6.** Падкрэсліце дзеяслоўныя формы, якія не адпавядаюць граматычным нормам сучаснай беларускай мовы. Запішыце іх правільна.

Максімальная колькасць балаў – 6.

1) абамкнуць *зак.*: абамкнем, абамкняце, абамкнуў (______________________);

2) абаткнуць *зак.*: абаткнём, абаткнеце, абаткнуў (______________________);

3) абвергнуць *зак.*: абвергнем, абвергнеце, абвергнуў (______________________).

**Заданне 7.** Аднавіце "слоўнікавыя" часткі кожнага з элементаў прыказкі-наватвора *Калі ўлез у дугу, то скуры не дзяруць.* Растлумачце значэнне кожнага з фразеалагізмаў.

Узор: *Паволі едзеш – каню свята* ← (1) *Паволі едзеш* – далёка станеш ('калі робіш нешта без спешкі, акуратна, хутчэй дасягаеш пастаўленай мэты'); (2) Баба з калёс – *каню свята* ('калі нехта адмаўляецца ад чагосьці, для тых, хто застаўся, будзе лепш').

Максімальная колькасць балаў – 4.

**Заданне 8.** Запоўніце табліцу (с. 64).

Максімальная колькасць балаў – 9 (1 бал за правільны адказ).

**Заданне 9.** Устаўце прапушчаныя словы, запішыце назву твора і яго аўтара.

Максімальная колькасць балаў – 6.

Бывае, праўда вочы коле…
Раз гнаў пастух свіней у поле.
Адзін ______________ Парсюк,
Які аббегаў вёску ўсю,
За раніцу ______________ завуголле,
Цяпер такі меў выгляд важны,
Што носа не дастаць і сажнем –
Вышэй за ўсіх ён сам сябе лічыў.
А што ў самога на лычы,
Не бачыў гэтага, аднак.
І вось адзін тут Падсвінак,
Які заўважыў бруд раней,
І кажа: – Дзядзечка, твой лыч у брудзе!
______________ гэта й між свіней,
А што ж, калі заўважаць людзі?
Парсюк наставіў хіб, Парсюк раз'юшан:
– Цераз цябе я чырванець прымушан!

**Табліца.**

| № п/п | Тып мастацкага тэксту | Аўтар | Сапраўднае імя аўтара | Твор | Жанр | Характэрныя спосабы і прыёмы раскрыцця зместу |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | вершаваны | Якуб Колас | | "Ручэй" | | |
| 2. | | Янка Купала | | | паэма | зварот да гістарычнага мінулага, паэтычнае асэнсаванне народнай легенды пра Машэку |
| 3. | празаічны | | | "Сірочы хлеб" | | партрэт, дыялог |

Такое мне сказаць асмеляцца нямногія,
Дык гэта ж – дэмагогія! –
Парсюк наш лаецца – не даравацьклянецца:
– І месца мокрага, – крычыць, – не застанецца!
Ты мой ________________ гонар закрануў! –
І так ён Падсвінака грызянуў,
Што той за сажняў пяць адскочыў.
Парсюк не надта быў ахвочы
Глядзецца праўдзе ў вочы.

Назва твора: ________________________________.

Аўтар твора: ________________________________.

**Заданне 10.** Ніжэй прыведзеныя дзве цытаты з вядомага вам мастацкага твора. Як называецца гэты твор? Да якога роду і жанру літаратуры ён належыць? Хто яго аўтар? Якое імя мае галоўны герой?

Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал за кожны правільны адказ).

"Вось гэтак, бывала, і пры бацьку ішла за сталом размова, звычайная для вёскі: пра карову, кабаноў, сена, авечак. І тады не аднолькава ў хаце думалі. Бацька, бывала, у адно, што бык, увапрэцца, не саступіць, а маці ў другое. І паспрачаюцца. Але ніколі, здаецца, ад тых спрэчак не нарастала на душы столькі гаркаты, прыкрасці".

"Ён моўчкі глядзеў, як жанчыны таўклі ў багажнік вядро з мочанымі яблыкамі, а яно не ставілася, месца не хапала, нават слоікі не было як утачыць, а яшчэ на зямлі стаяла вядзёрная каструля з капустаю, ручніком абвязаная. Павымалі сумкі, пачалі ставіць нанава. Куткі нарэшце ўсяму пазнаходзілі, а зачыніць багажнік не маглі".

Назва твора: ________________________________.

Род і жанр твора: ____________________________.

Аўтар твора: ________________________________.

Імя галоўнага героя: _________________________.

## ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

### Багдановічу

Сцюжны час, бязмежна-суровы.
Спіць народ, нібы зерне ў раллі.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Ты прыйшоў
І гарачым словам
Рунь узняў на роднай зямлі.
Ты сказаў нам:
"Унукі Скарыны,
Дзе ваш гонар, моц і краса?
Ёсць і ў вас, як і ў іншых, святыня.
Не давайце святыні псам!
Не давайце з яе глуміцца,
Бо праспіць яна ясну зару,
Бо святы ізумруд заімгліцца
У пярсцёнку тваім, Беларусь".
Ты устаў на лютую сечу,
Бітву вечную сонца і хмар,
Узваліўшы на юныя плечы
Святагораў народны цяжар.
І не вынеслі жылы напругі:
Знік ты, лебедзь, у хвалях сівых,
Сплыў крывёю, загінуў "за другі",
За мяне, за вас і за ўсіх.
І застаўся ты ў нашых душах,
Хоць навекі знік у палях,
Вечна светлы і вечна дужы,
Вечна юны, як наша зямля.

Мы табой ганарымся – і плачам.
Мы нясём цябе ў сэрцы праз дым.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Нізка голаў схіляю, юнача,
Перад вечным глаголам тваім.
Смела крочу цяпер у пяскі я
Перад светлай заветнай гарой,
Бо як ёсць у народа такія –
Не загіне давеку народ.

У. Караткевіч.

## ДАВЕДКІ

**Заданне 1.**

Вэ[*дз*]гаць : пэ[*ц*]каць = ду[*б*]ок : (х[1]) *аха*[*п*]*ак* = (х[2]) [*дж*]*ала* : [*ч*]ацвер = (х[3]) [*г*]анак : [*к*]*арак.*

Вылучаныя гукі ў словах адрозніваюцца *звонкасцю – глухасцю.*

Каментарый: Дапускаюцца ўсе варыянты, што адпавядаюць проціпастаўленню *звонкі – глухі.*

**Заданне 2.**

1) Месны – *'склон, які адказвае на пытанні "аб кім? аб чым?"'*; местны – *'які належыць да пэўнай мясцовасці, не прывазны'*.

2) Поўнач – *'адзін з чатырох напрамкаў свету'*; полночь – *'сярэдзіна ночы'*.

3) Маніць – *'хлусіць, гаварыць няпраўду'*; манить – *'клікаць, прываблівацьʼ*.

**Табліца 1.**

| № п/п | Тып мастацкага тэксту | Аўтар | Сапраўднае імя аўтара | Твор | Жанр | Характэрныя спосабы і прыёмы раскрыцця зместу |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | вершаваны | Якуб Колас | *Канстанцін Міцкевіч* | "Ручэй" | *верш* | *пейзаж / апісанне (карціны прыроды, адухаўленне карцін прыроды і да т. п.)* |
| 2. | *вершаваны* | Янка Купала | *Іван Луцэвіч* | *"Магіла Льва"* | паэма | зварот да гістарычнага мінулага, паэтычнае асэнсаванне народнай легенды пра Машэку |
| 3. | празаічны | *Янка Брыль* | *Янка (Іван Антонавіч) Брыль* | "Сірочы хлеб" | *апавяданне* | партрэт, дыялог |

**Заданне 3.**

*Сінонімы*: невычэрпны – незлічоны, няўдача – фіяска; *антонімы*: адзець – скінуць, налева – направа; *паронімы*: фабрыкант – фабрыкат.

Каментарый: 1 бал за кожную правільна вызначаную групу. Прымаюцца іншыя варыянты аб'яднання пар слоў у групы, калі яны лагічна абгрунтаваны.

**Заданне 4.**

| Усе словы з малой літары | 1-е слова з вялікай літары | 2-е слова з вялікай літары | Усе словы з вялікай літары |
|---|---|---|---|
| ахілесава пята; дамоклаў меч; дзякаваць богу [усё добра] | Дзень бібліятэк; Зосьчыны рэчы | графства Сусэкс; ляднік Ламберта; род Сапегаў | Божая Маці; Дзень Перамогі |

**Заданне 5.**

Правая рука – *'першы памочнік, супольнік, незамяніми чалавек для каго-н.'*.

Прыкладныя варыянты адказаў на другую частку задання:

1. Ён мая правая рука.
2. Правая рука загадчыка прачытаў нам новае распараджэнне.
3. Дырэктар выклікаў сваю правую руку, Пятра Іванавіча, на даклад.
4. Іван, правая рука дырэктара, зайшоў у кабінет.
5. Побач з правай рукой старшыні стаялі іншыя члены савета.

**Заданне 6.**

1) абамкнуць *зак.*: абамкнем, абамкняце, абамкнуў (*абамкнём*);

2) абаткнуць *зак.*: абаткнём, абаткнеце, абаткнуў (*абаткняцé*);

3) абвергнуць *зак.*: абвергнем, абвергнеце, абвергнуў (*абверг*).

**Заданне 7.**

*Калі ўлез у дугу, то скуры не дзяруць* ← (1) ***Калі ўлез у дугу*** *– не кажы "не магу"* (*'распачатае трэба давесці да канца'*); (2) *Калі мядзведзь у лесе,* ***то скуры не дзяруць*** (*'загадзя не зрабіўшы, не хваліся'*).

**Заданне 8.**

Гл. табліцу 1.

**Заданне 9.**

Бывае, праўда вочы коле…
Раз гнаў пастух свіней у поле.
Адзін *вялізарны* Парсюк,
Які аббегаў вёску ўсю,
За раніцу *абшнырыў* завуголле,
Цяпер такі меў выгляд важны,
Што носа не дастаць і сажнем –
Вышэй за ўсіх ён сам сябе лічыў.
А што ў самога на лычы,
Не бачыў гэтага, аднак.
І вось адзін тут Падсвінак,
Які заўважыў бруд раней,
І кажа: – Дзядзечка, твой лыч у брудзе!
*Нязграбна* гэта й між свіней,
А што ж, калі заўважаць людзі?
Парсюк наставіў хіб, Парсюк раз'юшан:
– Цераз цябе я чырванець прымушан!
Такое мне сказаць асмеляцца нямногія,
Дык гэта ж – дэмагогія! –
Парсюк наш лаецца – не даравацъ клянецца:
– І месца мокрага, – крычыць, – не застанецца!
Ты мой *свінячы* гонар закрануў! –
І так ён Падсвінака грызянуў,
Што той за сажняў пяць адскочыў.
Парсюк не надта быў ахвочы
Глядзецца праўдзе ў вочы.

Назва твора: "Ганарысты Парсюк".

Аўтар твора: Кандрат Крапіва (Кандрат Кандратавіч Атраховіч).

**Заданне 10.**

Назва твора: "Дзяльба кабанчыка".

Род і жанр твора: эпас, апавяданне.

Аўтар твора: Віктар Карамазаў.

Імя галоўнага героя: Сцяпан.

Падрыхтавалі
**Усевалад РАГОЙША,**
**Аляксандр РАДЗЕВІЧ,**
**Ірына САВІЦКАЯ.**